Opłata pocztowa uiszczona ryczałtem.

№ 25 (54) Пятніца, 29-га ліпня 1927 г. м. Вільня. Год II.

БЕЛАРУСКАЕ СЛОВА

Выходзіць раз у тыдзень Цана нумару 20 грош.

Нацыянальнае ... я і культурна-нацыянальная аутаномія.—Зямля сялянам на падставе уласнасьці.—Шырокі дэмакратыз ... ацыянальная царква.—Краевая згода. Далучэньне Усходняй Беларусі да Заходняй



Падпісна ...
„ ...
З ...
...рэс ... адміністрацыі: Wilno ul. Zawalna 6 m. 4
...акі... ад 12—2 гадз. штодня апрача сьвятаў.

Цана абвестак: На 1 старане —20 гр.
„ У тэксце . —40 гр.
„ На 4 старане —15 гр.
За кожны мілім. шырыны ў 1 шпальту.
Старана мае 8 шпальтаў.

Мусаліні сказаў: „Сіла чалавека вымяраецца лікам яго ворагаў"...

Глыбокая ісьціна.

Што Бел. Нац. Рада за апошнія некалькі месяцаў выявіла сваю сілу, акурат можна судзіць па інтэнсыўнасьці і ліку нападкаў яе ворагаў. Варта толькі ўзяць газэты нашых ворагаў палітычных „Праўду" і „Сельніву", каб праканацца ў гэтым.

Аднак-жа і ў спосабе барацьбы „Праўды" з намі, якая, бязумоўна, нязьмерна разумнейшая і інтэлігэнтнейшая за „С. Ніву", заметна пэўная новая рэч. „Праўда" да гэтага часу амаль ня выключна ўсю барацьбу вяла ў плошчы безабразных, некультурных нападаў характэру пэрсональнага. Правадыры „Праўды" спадзеваліся, што ім удасца бясканечна ілжывай лаянкай скампраматаваць пэўных асобаў, стоячых на чале нацыянальнай акцыі, а значыць гэтым самым падрэзаць і ўсю акцыю. Але практыка паказала ім іншае. Ня ўдалося ім скампраматаваць правадыроў, а акцыя нацыянальная пашыраецца, захопліваючы ўсё большыя кругі.

І вось „Праўда" бярэ „зусім новы тон!" У № 33 яна піша: „Але радасьць прадстаўнікоў варожае масам *буржуазнай ідэалёгіі* была нядоўгая. Хоць і пазбаўленыя „галоў", беларускія працоўныя масы не пайшлі аднак ні за Паўлюкевічам, ні за кс. Станкевічам, ні за ягонымі падгалоскамі Ярэмічамі ды Рагулямі..." І далей: „беларускае пытаньне наагул—у шырокім разуменьні—ня вырашана датуль, дакуль *клясавае змаганьне* ня дасьць *перамогі працоўным!...*"

„Праўда" усе беларускія *нацыянальныя* групы называе буржуазнымі і праціўставіць іх групам *сацыяльна-працоўным*, ці па нашаму пралетарска-камуністычным.

Далей „Праўда" даказвае, што адзіным сродкам, каб наступіў рай на зямлі і была дасягнута поўная нацыянальная свабода — ёсьць „клясавае змаганьне і *перамога працоўных*". Зразумела, што гэтая *перамога* разумеецца ў духу тэй перамогі, якую „Праўда" бачыць у СССР. Мы-ж лічым, што толькі высілкамі *ўсей* беларускай нацыі можна здабыць усялякую свабоду, а ня высілкамі паасобнай толькі групы „*працоўных*", якую грамадаўская „Праўда" на прыкладзе разумее так, што селянін, маючы 15 — 20 дзесяцін, ужо не „працоўны", а буржуй і г. д.

Мы слабыя яшчэ, як нацыя, і не разьбіваць нацыю на паасобныя клясавыя групы, а еднацца трэба ўсім пад адзіным нацыянальным сьцягам. У гэтым толькі ёсьць *сіла народу!*

Тутакамы кардынальна разыходзімся з Грамадою і ўсімі сацыялістычнымі групамі левага кірунку.

І практыка жыцьця паказвае, што мы мелі рацыю. Ня толькі бязупынны рост нашай арганізацыі, але нядаўнія выбары ў самаўрады паказалі, што еднасьць беларуская пад нацыянальным сьцягам была дамінуючай прычынай, якая прывяла да перамогі беларусаў на выбарах.

А гэта ёсьць *першы крок* да вызваленьня.

Дык нават адкінуўшы у бок усялякія безсумліўныя ўплывы і залежнасьць Грамады безпасрэдня ад маскоўскага камунізму, які прайграў сваю стаўку ў агульна-сьветовым масштабе — мы лічым, што сваю стаўку на „клясавую барацьбу" і дыктатуру „працоўных". Грамада ў беларускіх масах прайграла. На мейсца некалі магутнай Грамады падымаецца новая *Сіла*, сіла *Беларускай адналітай Нацыі*.

Камунікат
Цэнтральнага Беларускага Нацыянальнага Выб. К-ту.

У № 33 „Нашай Праўды" выдрукавана карэспандэнцыя з Сіняўкі аб выбарах у гмінную Раду. Там пададзена, што войтам выбраны „Антось Мілешкевіч, які скончыў Віленскую Беларускую Гімназію і які стаіць і *будзе* стаяць у абароне *працоўнага* народу"... Пры гэтым выбар п. Мілешкевіча проціўставіцца выбару п. Яроша.

Гэткім чынам з карэспандэнцыі выглядае, што п. Мілешкевіч, адтрымліваючы камплімэнт ад „Нашай Праўды", ёсьць сам амаль што не грамадаўцам, а па меньшай меры належыў падчас выбараў да якойсь іншай групы, чым п. Ярош.

Гэтым у імя праўды Камітэт сьцьвярджае, што:

1) Як п. Ярош, так і п. Мілешкевіч—абодва былі інструктарамі Бел. Нац. Выб. Камітэту на гміну Сіняўскую, а п. Мілешкевіч яшчэ дадаткова і на гм. Ляхавіцкую (аб чым падавалі ў „Бел. Слове" № 20).

2) Ня гледзячы на агітацыю грамадаўскіх прыхільнікаў, дзякуючы энэргіі інструктараў п. Яроша, Мілешкевіча і Шыбута, ўдалося ўтварыць з прадстаўнікоў усіх вясковых абводаў адзін беларускі сьпісак, які якраз састаўляў п. Мілешкевіч, дзякуючы таму Сіняўская гміна здабыла найвялікшую колькасьць беларускіх мандатаў (10 з12!).

3) Карэспандэнт не падае таго факту, што п. Ярош *ўсімі* беларускімі галасамі быў выбраны на лаўніка, аднак-жа адмовіўся згодна прапазыкі прадстаўніка камітэту п. Паўлюкевіча, (які прыехаў *пасьля* выбараў!), бо не была пэўнасьці ў зацьверджаньні п. Мілешкевіча войтам і тады-бы кандыдатам на войта камітэтам выстаўляўся п. Ярош.

4) Прэзыдыум камітэту ў свой час дзякаваў сябру Камітэту п. Паўлюкевічу за агонаю працу ў Несьвіскім павеце, дзякуючы якой беларусы—несьвіжане мелі ў свой час усю патрэбную прадвыбарчую літэратую, а цяпеР маюць бальшасьць праудзівых беларусаў нацыяналістаў у Радах і *першых* беларускіх войтаў і заступнікаў у Несьвіскім павеце.

Старшыня Камітэту
ДРУЦКІ-ПАДБЕРЭЗКІ.
Віцэ-старшыня КАНАПАЦКІ.
Сэкрэтар ШЫБКА.

АД РЭДАКЦЫІ: Асоба, пісаўшая гнюсную карэспандэнцыю ў грамадаўскую газэту, ёсьць рэдакцыі вядомай.

Радзім паскуднаму падпольнаму адзінаму ў Сіняўцы грамадаўцу, які падчас выбараў дарэмне стараўся *разбіць* беларускую еднасьць, а цяпер піша брэдні і ілжу на п. Паўлюкевіча спыніць сваю паскудную працу. Ці яму мала было, што ён сваей працай улякаваў было свайго прыяцеля маладога невопытнага хлапца Янку К. на пяць тыдняў да турмы у Несьвіжу? У якога потым вызваліў з турмы ніхто іншы, як п. Паўлюкевіч, двойчы езьдзіўшы да Несьвіжу і інтэрнаваўшы ў адміністрацыйнай ўлады і у следчага судзьдзі.

Першыя беларускія войты.

18 ліпня да гміннага ураду Палачанскай гміны выбраны:

Войтам — Мацей Пятровіч (інструктар Цэнт. Бел. Нац. Выб. Камітэту, віцэ-старшыня Цэнт. К-ту Бел. Нацыян. Партыі і сябра Бел. Нац. Рады.)

Заступнікам войта—Паўлюк Шафаловіч—інструктар Цэнтр. Бел. Нац. Выб. К-ту.

Лаўнікам, —Станіслаў Паўловіч—паляк—абшарнік.

Выбары зацьверджаны Старастай 22 ліпня

Палітычны агляд.

Аўстрыйская „рэвалюцыя" адкрыла Заходняй Эўропе вочы на многія рэчы. Перш-на-перш Захад яшчэ раз меў магчымасьць пераканацца ў жывучасьці камуністычнай гідры і неабходнасьці правядзеньня ў жыцьцё той пастановы, якая была вынесена на тайнай конфэрэнцыі шэсьці ў Жэнэве. Кіраўнікі заграничнай палітыкі 6 вялікшых Заходня-Эўрапэйскіх дзяржаваў, ня выключаючы на'т Нямеччыны, першы раз прыйшлі да згоды ў расейскім пытаньні. Першы раз пасьля вайны дайшло да стварэньня

адзінага моральнага фронту барацьбы з III інтэрнацыяналам.

Апошняю капляю, перапоўніўшаю чашу цярпеньня культурнага Заходу, паслужыла абнаўленьня сыстэмы тэрора ў Расеі. А актыўны ўдзел маскоўскіх агэнтаў у венскай рэвалюцыі павінен узмацніць гэтыя дзяржавы ў пераканаваньні магчыма хутчэйшай рэалізацыі жэнэўскай нарады, на якой ўнас ўдысананс толькі бэльгійскі міністар сацыяліста Вандэрвэльдэ, даводзіўшы, што III інтэрнацыянал ня трэба отождзествляць з радавым урадам Але гэта зусім зразумела, бо сацыялістыя заўсёды стаялі ў абароне бальшавізму, як праявы работніцкай ўлады. І ласьне гэта дае ключ да расшыфраваньня венскай трагікамэдыі.

Дзеля таго толькі, што ў Аўстрыі сацыялісты мелі найбольшы ўплыў на дзяржаўна палітычнае жыцьце, а сталіца яе Вена зусім была апанавана сацыялістамі,

маскоўскі інтэрнацыянал зрабіў Вену цэнтраляю сваей агітацыі ў Заходняй Эўропе.

Ніткі ўсіх камуністычных замахаў на Балканах і у Сярэдняй Эўропе вялі да Вены і там канчаліся, бо венскія „таварышы" не дазвалялі дакрануцца да асінага гнязда, створанага ў бальшавіцкім пасольстве. З другога боку гэтаму спрыялі і вонкавыя абставіны. Пасьля вэрсальскай нарады

пераможцы усімі мерамі спрыялі сацыялістычнай уладзе,

як лепшай гарантыі проці рэўстаўрацыі Гансбургска-Гогэнцолернскай манархіі ў Сярэдняй Эўропе. Адсюль ласкавыя адносіны да паўсацыялістычнай Аўстрыі пры варожа — падазрыцельных учуцьцях да фашыстаўскай Вэнгрыі. Гэткім чынам самі пераможцы, падтрымліваючы моральна і матэрыяльна сацыялістычныя ўплывы ў Вене, гэтым самым пасрэдня спрыялі росту бальшавіцкага тайнага парыву у сяродку Заходняй Эўропы, які раней ці пазьней мусіў лопнуць. І цяпер, калі з аднаго боку Англія і Францыя сталі тварам да твару з бальшавіцкаю небясьпекаю у сябе дома і прыйшлі да ўзаемнай згоды на грунце барацьбы з бальшавізмам, а з другога боку фашыстаўска-нацыяналістычныя Італія, Вэнгрыя і Нямеччына даюць прыклад найлепшага дабрабыту, у Парыжу і Лёндане павінны зразумець, што за венскую трагэдыю яны нясуць ня меншую адказнасьць, чым Масква і Бэрлін. Раз на заўсёды моцныя гэтага сьвету павінны адмовіцца ад шкадлівай і недастойнай учцівых людзей палітыкі падтрыманьня ўплываў, непажаданых для сябе, але аслабляючых свайго суседа ці канкурэнта. З Нямеччынай Гіндэнбурга хаўрусьнікі лепш дагаварыліся, чым з Нямеччынай сацыяліста Эбэрта. А што прадстаўляла бы сабою цяпер Заходняя Эўропа, калі-б замест Гіндэнбурга, Мусаліні, Бэтлена, Зэйпеля і іншых там панавалі Шэйдэманы, Турацц Джіоліцці, Ніцці, Стамбулінскія, Отто-Баўэры, Бэла-Куны і К-о. Прызналі-ж, нарэшце, неабходным для сябе Францыя і Англія зьвярнуцца да Пуанкарэ і Балдуіна, пахараніўшы безпав ротна Эррыё, Кайо, Макдональда і Л. Джоржа? Чаму ж ня прымяніць гэтай меркі і да іншых эўрапэйскіх дзяржаваў, прыняўшы пад увагу, што агульны мір і уласны дабрабыт залежыць ад унутранага міру паасобных эўрапэйскіх дзяржаваў? Нават рэвалюцыя ў маленькай Аўстрыі, калі-б толькі яна мела ўдачу, магла бы прычыніць Эўропе шмат клопату і падвергнуць сур'ёзнай небясьпецы яе мір.

З іншых палітычных падзеяў на Захадзе Эўропы трэба адмеціць

бэльгійска-нямецкае непаразуменьне,

ўзьнікшае на грунце рэваляцыйнай прамовы бэльгійскага пасла да парлямэнту Брукера і ваеннага міністра Броквіля. У той час, калі немцы збурылі частку сваіх усходніх укрепленьняў і, пасьля кантроля ваенных экспэртаў хаўрусных дзяржаваў, нямецкая дыплёмацыя, рыхтавалася выступіць перад Парыжам і Лёнданам з жаданьнем скарэйшай эвакуацыі Прырэйнскай вобласьці, даводзячы зусім пацыфістычныя пляны і настрой разаружнай Нямеччыны, бэльгійскі сацыялістычны пасол Брукер, адзін з паважнейшых прадстаўнікоў Бэльгіі ў Радзе Лігі, у сваей прамове 9 ліпня заявіў, што Нямеччына зусім не выпаўняе вэрсальскага трактату, што датычыцца рэйхсвэры і ваеннага ваaружэньня. Паводле вэрсальскага трактату немцы маюць права звальняць у запас кожны год толькі 5 проц. рэйхсвэры, (армія), якая ня можа перавышаць 100,000 чалавек, а запраўды немцы звальняюць кожны год у рэзэрв 15 проц. і імкнуцца да давядзеньня гэтай лічбы да 25 проц. Гэткім чынам цяперашняя нямецкая армія ў 100,000 чал. зьяўляецца толькі кадрам для шмат-мільённай арміі, у якую разьвярнецца на выпадак вайны, аб якой лятуцяць усе немцы. На гэту прамову нямецкае міністэрства заграничных справаў запярэчыла нотаю пратэсту, на якую бэльгійскі міністар ваенных справаў Броквіль адказаў прамоваю, заключаючай а сабе новыя абвінавачаньня Нямеччыны ў ваенных вааружэньнях і рыхтоўцы да вайны. Гэта яшчэ больш дабавіла масла да нямецкага незадаволеньня.

Гэта спрэчка між Нямеччынай і Бэльгіяй прыйшлася вельмі на руку Францыі, якой ў першую чаргу пагражае нямецкая нябесьпека У зьвязку з гэтым канфліктам францускія газэты паведамляюць, што немцы ў кожны момэнт могуць выслаць на свае граніцы 300,000 добра вааружоную з ног да галавы армію. Нямецкія выдаткі на ваенны матэрыял складаюць 45 міл марак у год, у той час як Францыя даткуе на гэту мэту толькі 39 міл. паперовых франкаў. Гэта значыць, што немцы у 7 разоў больш выдаткуюць на ваенны матэрыял пры 100,000 арміі, чым Францыя пры 500,000 арміі. Ня гледзячы на забарону ўтрыманьня вялікага гэнэральнага штабу, цяжкай палявой артылерыі і ваеннага вaздушнага флёту,

ваенны бюджэт Нямеччыны дасягае 62 проц. таго, што выдавалася на 800,000 армію ў 1913 г.

Наагул па славам міністра Броквіля і францускага сэнатара Экорда,

немцы выдаткуюць на ваенны ма-

Апошнія навіны.

З Польшчы.

ПРЭЗЫДЭНТ РЭСПУБЛІКІ АДХІЛІЎ ПРОСЬБУ АБ ПАМІЛАВАНЬНІ КАВЭРДЫ.

Палявы суд, як ведама, прысуджаючы Барыса Кавэрду на пажыцьцёвую цяжкую турму, пастанавіў адначасна зьвярнуцца з просьбаю да Прэзыдэнта Рэспублікі аб замене гэтай цяжкай кары на 15 гадоў цяжкай турмы. Прэзыдэнт Рэспублікі адхіліў гэтую просьбу.

Запамогі ахвярам урагана Наваградзкага ваяводзтва.

Рада міністраў на паседжаньні 25 ліпня ўхваліла выдаць запамогу насяленьню пяці паветаў Наваградзкага ваяводзтва, гаспадаркі якога былі зьнішчаны бураю і ураганам 12–15 чэрвеня. З гэтаю мэтаю міністар працы павінен асыгнаваць 750,000 зл. на адбудову зьнішчаных будынкаў, як доўгатэрміновых пазык з малымі працэнтамі, а міністр асьветы — 50,000 зл на адбудову школаў і цэркваў. Нарэшце міністр рольніцтва павінен выдаць адносныя распараджэньні, каб пацярпеўшыя мелі пяршэнства пры пакупцы дзерава з зьнішчаных дзяржаўных лясоў па льготным цэнам.

АДБУДОВА ЖАЛЕЗНАЙ ДАРОГІ.

Рада міністраў ухваліла з даходаў жалезнай дарогі вызначыць 20,160,000 зл. на адбудову жалезнай дарогі.

РУМЫНСКІ КАРОЛЬ ФЭРДЫНАНД.



20 ліпня памёр румынскі кароль Фэрдынанд. Яму насьледаваў сын Міхаіл, з прычыны малалецтва якога кіраўніцтва дзяржаваю прыняла на сябе рэгэнцкая рада.

ВЫБАРЫ ДА ГМІННЫХ САМАЎРАДАЎ ВАЛЫНСКАГА ВАЯВОДЗТВА.

Выбары да гмінных самаўрадаў у 80 гмінах з агульнай лічбы 95 у Валынскім ваяводзтве далі наступныя вынікі: Палякі — 203 радных, украінцы — 694, жыды — 35, чэхі — 25 і немцы — 8, усяго 965 радных. Палякі складаюць 21 проц., украінцы 72 проц. агульнага ліку.

ВЫБАРЫ ДА МЕЙСЦОВЫХ САМАЎРАДАЎ НА ВАЛЫНІ.

„Przegląd Wołyński" падае наступныя вынікі выбараў да месцовых самаўрадаў на Валыні: у 19 местах усяго выбрана 343 радных, з якіх палякаў—70 (20,4 проц.) украінцаў—58 (16,9 проц.) жыдоў 203 (59,2 проц.), чэхаў—2 (0,6 проц.), немцаў — 1 (0,3 проц.), і расейцаў — 9 (2,6 проц.).

ЛІКВІДАЦЫЯ КАМУНІСТЫЧНАЙ АРГАНІЗАЦЫІ.

Час-ад-часу газэты паведамляюць аб „ліквідацыі" рожных „цэнтральных" камуністычных арганізацыяў, аб камуністычных судовых працэсах, а на места „зьліквідаваных" вырастаюць новыя, як галавы ў гідры. 22 ліпня ў Варшаве і Усх. Галіцыі была „зьліквідавана" новая камуністычная арганізацыя Заходняй Украіны, у склад якой уваходзіла шмат інтэлігэнцыі, студэнтаў і студэнтак. Канфіскавана каля 20,000 тысяч адозваў, у якіх „кам. партыя Зах. украіны прызывае да збройнага паўстаньня проці Польшчы і прылучэньня да Радавай Расеі".

Вобыск у рэдакцыі месячніка «Natio».

У Варшаве па загаду ўлады быў зроблены вобыск у рэдакцыі месячніка „Natio" выдаванага супольна нацыянальнымі меншасьцямі ў Польшчы. У выніку гэтага вобыску быў арыштаваны заступнік рэдактара Арыо. Рэдактарам месячніка зьяўляецца украінскі палітычны дзеяч д-р Лысак, а да рэдакцыйнага камітэту належаць прадстаўнікі ўсіх нац. меншасьцяў у Польшчы, а ласьне: Грынбаум, Лысак, Астэн, Ярэміч і Альсейка. Праз два дні Арыо быў звольняны з арышту.

АХВЯРЫ ДЛЯ БАРЫСА КАВЭРДЫ.

У рэдакцыю газ. „Возрожденіе" ў Парыжу да 20 ліпня паступіла 18,486 францускіх франкаў ахвяраў для Барыса Кавэрды.

З заграніцы.

ЭПІЛОГ ВЕНСКАЙ „РЭВАЛЮЦЫІ".

Да гэтай пары арыштавана ў Вене каля 3,000 вучастнікаў безпарадкаў. Найбольшы лік арыштаваных складаюць камуністы.

У Гішпаніі неспакойна.

Францускія газэты паведамляюць з Мадрыда, што ў Гішпаніі зноў пачалося вялікае незадаволяньне сярод афіцэраў і кадэтаў дыктатураю Прыма дэ-Рывэры. Зроблена шмат арыштаў сярод юнкэраў. Гэтак сама расьце незадаволяннасьць сярод работнікаў.

БРАЖЭНЬНЕ СЯРОД ФРАНЦУСКІХ РЭЗЭРВІСТАЎ.

Бражэньне сярод рэзэрвістаў моцна непакоіць францускі ўрад. У лагэры рэзэрвістаў у Туры адбылася дэманстрацыя, у часе якой салдаты пялі інтэрнацыянал. Афіцэры падвергліся абразе. 2 салдаты арыштаваны.

У ФРАНЦЫІ НАСАЛІЛІ.

Францускі пасланнік у Маскве Гэрбэт зьвярнуўся да Чычэрына з прапазыкаю, каб бальшавікі спынілі сваю агітацыю ў Францыі, калі жадаюць захаваць добрыя адносіны з Францыяю, бо цяперашняя сытуацыя ня можа быць цярпіма францускай апініяй.

БАЎГАРЫЯ І ЧЫРВОНАЯ НЕБЯСЬПЕКА.

У баўгарскіх палітычных колах разглядаюць венскія падзеі, як вынік дзейнасьці камуністаў. Бальшавіцкі ўплыў ужо даўно адчуваўся ў Вене, якая стала цэнтрам рэвалюцыйнай прапаганды для Балкан і ў часнасьці для Баўгарыі. Прэса выражае надзею, што Аўстрыйскі ўрад займе цяпер больш рашучую пазыцыю ў адносінах бальшавіцкіх агэнтаў.

Злучаныя Штаты проці бальшавізма.

Прэзыдэнт амэрыканскіх гандлёвых палатаў Левіс Пэрсэн адхіліў прапазыцу адчыненьня ў Маскве бюра для падтрыманьня гандлю між злучанымі Штатамі і Радамі, тлумачучы сваю адмову тым, што гэта магло-бы пацягнуць за сабою шкадлівую бальшавіцкую прапаганду ў Злучаных Штатах. Крок гэты азначаў-бы выступленьне амэрыканскага фінансавага сьвета проці пазыцыі, занятай амэрыканскім урадам. Гандлёвыя палаты энэргічна пратэстуюць проці праэкту, аснованага на тым, каб цаною матэрыяльных выгад прызнаць дзяржаўны строй, апіраючыся на каварнай тыраніі і пагвалчэньню індывідуальнай свабоды. Палаты не забылі досьледаў, вынясеных іншымі дзяржавамі з гандлёвых адносінаў з Радамі.

Новы курс нямецкай палітыкі.

Амэрыканская газ. „New Iork World" піша, што мэтаю нямецкіх вааружэньняў на амэрыканскі манер зьяўляецца падрыхтоўка Нямеччыны да вайны з Расеяй.

У чырвоным пекле.

Нэрвовы настрой у Кармлі.

Паводле вестак бэрлінскіх газэт з радавай Расеі ў Крэмлеўскіх колах пануе надзвычай нэрвовы настрой ў зьвязку з прэдстаячым скліканьнем нарады цэнтральнага камітэту камуністычнай партыі. Ходзяць чуткі, што конфэрэнцыя цэнтральнага камітэту яшчэ больш расшырыць кола праціўнікаў бальшавікоў. Кіраўнікі апазыцыі разам з Троцкім і Зіноўявым рашылі ня прызнаваць ніякіх пастановаў цэнтральнага камітэту да скліканьня конфэрэнцыі партыі. Свае вымаганьні апазыцыя фармуліруе гэтак: 1) Прыняцьце прыхільнікаў апазыцыі на іх сталыя пасады. 2) Абмежаваньне ўлады сэкрэтара партыі Сталіна. 3) Ліквідацыя чырвонага тэрору. 4) Рэарганізацыя партыі на дэмакратычных асновах. 5) Зварот Зіноўява на пасаду старшыні комінтэрна.

НАСТРОЙ У С. С. Р. Р.

З рэзалюцыі маскоўскай камуністычнай арганізацыі вынікае, што „ўнутры страны ідзе падрыўная праца проці пралетарскай дыктатуры: Узрост антысэмітызма шовіністычны настрой у паасобных праслойках моладзі, актыўная дзейнасьць духавенства і сэктанства, павялічэньне актыўнасьці зьменавехаўскай інтэлігэнцыі. Нэйманаўскіх і Кулацкіх элемэнтаў прымушаюць зьвярнуць увагу ўсей арганізацыі на неабходнасьць самага рашучага а пора ўсім антыпролетарскім уплывам".

Паніка на Украіне.

На Украіне насяленьне масова купляе соль. Купля гэта мае характар палітыкі. У многіх дзяржаўных магазынах выкупляны ўсе запасы солі. Прычынаю гэтага зьяўляюцца чуткі аб няўнікнёнай вайне.

117 ЕПІСКАПАЎ У ТУРМЕ.

Сінод расейскай праваслаўнай царквы за граніцаю адтрымаў з радавай Расеі сьпісак праваслаўных епіскапаў, якія сядзяць у турмах ці высланы ў ссылку да Сібіры і на Салавецкія выспы. У сьпіску гэтым 117 фаміліяў епіскапаў, на чале якіх стаіць патрыярх расейскай праваслаўнай царквы мітрапаліт Пётра Крутыцкі высланы ў Табольскую губ.

Развал „Жывой" Царквы.

Бальшавікі, каб падарваць у народзе веру, аснавалі гэтак званую „жывую" царкву з прадажных элемэнтаў праваслаўнага духавенства.

І у той час, як вернае запавядзям Хрыста праваслаўнае духавенства падвергаецца ганеньню і прасьледаваньню, „жывацаркоўнікі" карыстаюцца ўсімі льготамі і палёгкамі. Бальшавіцкая прэса заўсёды трубіць аб пасьпехах „жывой" царквы. Дык вось з „Вестніка" „жывацаркоўнага" сыноду, які выходзіць у Маскве, відаць, як „разьвіваецца жывая Царква" і як да яе адносіцца народ: у 1926 г. лік „жывацаркоўных" прыходаў паменшыўся на 2,794. Ні ў аднэй з епархіяў лік абнаўленчэскіх прыходаў не павялічыўся. Адкалоўшыяся прыходы „жывой" царквы вярнуліся да „Ціханаўскай" Царквы. „Вестнік" тлумачыць пасьпех „Ціханаўскай" Царквы тым, што „вялікія па-

---

тэрыял у 40 разоў больш, чым Францыя.

І калі-б Францыя захацела зраўняцца ў гэтых адносінах з Нямеччынай, дык яна мусіла-бы патрэбаваць ад парлямэнту крэдыту не 39 міл. паперовых фр., але больш мільярда

Апрача тэхнічнай падгатоўкі да вайны **немцы яшчэ рыхтуюцца фізычна,** ведаючы добра з практыкі, што на вайне перамагае толькі нацыя з моцным здаровым духам, а „здаровы дух жыве толькі ў здаровым целе". Увесь нямецкі народ складаецца з адных сплашных рожных спартыўных арганізацыяў, бо нішто гэтак не ўзмацняе фізычна чалавека, як спорт. Апрача зімовага спорту на лыжах у лясох і горах, стралковых арганізацыяў, гімнастычных і г.д. з вялікаю любоў'ю разьвіваюцца рожныя гульні, як у футбол, тэніс, гольф і г. д. Наступныя лічбы лепш усяго ілюструюць гэта імкненьне Нямеччыны да фізычнага ўзмацненьня сваей нацыі шляхам незабароннага вэрсальскім трактатам спорта.

У Нямеччыне ёсьць каля 3,000 лёгкаатлетычных клюбаў, у якіх актыўна працуе 440,000 сябраў. Уся страна пакрыта сеткаю гімнастычных таварыстваў, уходзячых у склад агульна нямецкага саюзу з 1,6000,000 сябраў. Футбольных клюбаў 6,400 з 875,000 мастакоў — сябраў, хоккэй скупляны у 580 клюбах з 30,000 сябраў. У Гольф, яшчэ малады спорт, гуляе 5—6,000. Далей вельмі папулярны спорт бокса, плаваньня, грэблі, нарэшце веласіпэдны, матацыклёвы і турызм. Як зімаю, гэтак сама і летам горы Гарца, Саксоніі і Баварыі перапоўнены турыстамі з усей страны. Гэтаму спрыяюць густая сетка жалезных і шосэйных шляхаў, рэчак і каналаў і наагул удобны і танны спосаб перадвіжэньня. І у гэтых адносінах з немцаў можна узяць толькі прыклад. У нядзелю ці сьвята у нямецкім месьце ці вёсцы не забачыш п'яных. Затое масы як мейсцовага, гэтак і вясковага насяленьня, хлапцоў, дзяўчат, нават старыкоў і дзяцей тоўпамі ідуць і едуць у горы, лясы, на рэкі, гімнастычна-фудбальныя стадыёны, гімнастычныя сьвяткаваньні і г. д. На кожным кроку бачым здаровы, вясёлы вобраз жыцьця культурнай нацыі.

N.

Беларуская „ком'ячэйка" у Празе Чэскай.

(Крыху увагаў з прычыны выхаду № 1-га „НАШАГА ПРАМЕНЯ").

Як ведама, ўжо некалькі год прабываюць у Празе беларускія студэнты — эмігранты з захопленае бальшавікамі Ўсходняе Беларусі. Дзякуючы спагадным адносінам да беларускага руху чэскага ўраду, колькасьць іх штогод пабольшываюць матурысты з беларускіх гімназіяў ў Польшчы, прад якімі зачынены дзьверы вышэйшых асьветных установаў у краі.

(*Nota bene* гэта наша болька ў хуткім часе будзе, здаецца, ўхілена, бо, як нагадуюць віленскія польскія газэты, пачынаючы ад сёлетняга году (1927 — 28) беларуская гімназія ў Вільні робіцца ўрадовай і атрымлівае правы; гэтак-жа маюць быць рэарганізаваны і іншыя беларускія гімназіі ў Польшчы).

Беларускія студэнты, ў ліку паўтараста з лішкай складаюць пераважную большасьць беларускай калёніі у Празе, адыгрываючы тамака ролю найбольш рухавае яе часткі.

Гэты студэнцкі гурток, творучы ў пачатку згодную, нацыянальна-адзіную групу людзеў аб'яднаных патрыятычным пачуцьцём, з часам пачынае разьбівацца на што раз, то драбнейшыя групы і групачкі, войстра змагаючыяся паміж сабой. Усе гэтыя групкі і арганізацыі — недоўгавечныя; яны гэтак часта мяняюць свае назовы і мэты, што на'т найбольш пільнаму наглядчыку трудна разабрацца ў іх дэтальна і неяк скляcыфікаваць у хронолёгічным парадку!

Што-ж выклікала гэткі падзел? — Выклікала яго работа бальшавіцкіх агэнтаў, якія, агітуючы сярод беларускіх студэнтаў у Празе, патрапілі абдурыць больш гарачыя і бязкрытычныя галовы і перацягнулі пэўны лік гэтых студэнтаў на бок радавае (савецкае) ор'ентацыі.

Ў рэзультаце паўсталі два лагеры: *нацыянальны* і *бальшавіцкі*, крыючыся пад прыгожай маскай „паступовага (?!) студэнцтва". У кожным лагеры папаўставалі рожныя палітычныя, культурна-прасьветныя, спартыўныя і г. п. арганізацыі і таварыствы, вядучыя да шкоднага паралелізму ў працы, лішняй раздробленнасьці, а гэтым самым і — слабасьці гэтых, робленых „на выраст", згуртаваньняў.

Дзякуючы нязначнай колькасьці сябраў ў паасобных арганізацыях, таго, ці іншага лагеру, яны часта заміраюць а пасьля пэўнага часу адраджаюцца ізноў пад зьмененым назовам і з крыху іншым складам прэзыд'юма. Абодва напрамкі выдаюць ад часу да часу свае собскія органы; называюцца яны месячнікамі, але выходзяць непэрыядычна і пасьля пэўнага часу спыняюцца. Гэтак бачылі мы гэктографов ны орган нацыянальнага лагеру — месячнік *„Беларускі Студэнт"*; пасьля-ж некатарага часу выйшла пара нумароў *„Перавясла"*, афіцыоза бальшавізуючай групы, апошнім жа часам, ў чэрвені 1927 г., паказаўся у Празе ўжо *выразна-бальшавіцкі „Наш Прамень"*, — „часопісь паступовага студэнцтва", — як яна скромна сябе называець.

Калі ідзе аб вонкавы выгляд гэтага „непэрыядычнага выдаваньня", дык трэба прызнаць яго вельмі ўдалым, з усяго відаць, што бальшавіцкія „апякуны" не пашкадавалі гропаў на вельмі карысную для іх „агіт літэратуру": папера — добрая, друк — выразны, карэкта — старанная і, — што асабліва цікава, даволі чыстая мова!

Журнал гэты, лічачы ажно 84 старонкі, павялічанай васьмёркі, адзначаецца даволі рожнародным, палітычным зьместам, але ўсе зьявішчы, закранутыя ў ім асьвечаны тэндэнцыйна і аднабока!

Усе палітычныя праявы, ці то беларускія, ці то сусьветныя, разважаюцца ў ім з пункту гледжаньня чыста бальшавіцкага, настроены па камэртону радавай прэсы, некаторыя-ж артыкулы, асабліва датычачыя польска-беларускіх адносін выразна інспіраваны праз бальшавіцкіх агэнтаў!


Тон усяго журналу — выдатна едкі, войстра-напастлівы, жоўчна-брахлівы.

Зьмест журналу наступны: 1) „Тэстамэнт" — рэвалюцыйны вершык п. Д., датаваны: „Вільня Лукішкі. 1926" г., 2) М. Віленскі: Сусьветнае „разбраеньне", 3) Палітычнае жыцьцё ў Зах. Беларусі, 4) Аб справаздачы Ураду Савецкае Беларусі на сэсіі Ц. В. К. С. С. Р. Р., 4) Т. Г. Зямельныя адносіны на Беларусі 5) Сучасны стан Польшчы, 6) Галынец: Белы тэрор у Польшчы (з ілюстрацыямі) 7) Гэнры Барбюс аб фашызму, 8) Гамма: Новыя саюзьнікі польскага фашызму, 9) Кудаса: „Ой зірні..." (верш), 10) Р. Кудаса: „Дзень на Ўсходзе", 11) Д.: *** (Заход полымя пылае) — верш, 12) Бэхэр: „Казьнены" (новэлла) — пераклаў з нямецкага А. Д. 13) Хроніка: а, Савецкая Беларусь, б) Чэхаславакія, в) У фашысцкай Літве, 14) Рознае (ўсячына).

З усіх гэтых артыкулаў ды зацемак агідных здраднікаў беларускае справы у якіх ў роўнай меры абліваюцца памыямі і „Беларускае Слова", і хадэкі, і „Беларускі дзень", і сельсаюзьнікі, Урад Беларускай Народнай Рэспублікі, і эсэры, рэлігія і духавенства, ды ўсе „буржуазныя" дзяржавы Захаду, а ўсхваляюцца: Савецкая Беларусь, Грамадаўцы, ды соцыяльная рэвалюцыя, — найбольш могуць зацікавіць віленскае беларускае грамадзянства, як закранаючыя тутэйшыя адносіны, тэндэнцыйна-абсурдныя артыкулы: 1) *О, „Палітычнае жыцьцё ў Заходняй Беларусі"* (ст. 5 — 16) і 2) *Гамма: „Новыя саюзьнікі польскага фашызму"* (ст. 59 — 62) якімі, на думцы бязглуздага аўтара, маюць быць беларускія палітычныя эміграны ў Празе, дзякую-

трасеньні сярод некатарых епархіяў выклікаў зварот з ссылкі епархіяльных епіскапаў. Акружоныя арэолам мучаніцтва яны ў самы кароткі час пасьпелі адабраць дзесяткі прыходаў (Вароняж, Владзімір, Саратаў, Івана-Вазнесенск"). Абіда абнаўленцаў тым балей зразумела, што гэтых епіскапаў і ў ссылку выслалі па даносам . тых-жа „жывацаркоўнікаў".

ЛЯГУШКА і ВОЛ.
(З баек Крылова).



На манэўры англійскага ваеннага флёта у Балтыцкім моры бальшавікі адказалі „вялікімі, манэўрамі чырвонага флёта ў Фінскай затоке.

„Батрак Украіны"

„Труд" (№ 149) падае вынікі абсьледаваньня рольна-гаспадарчых работнікаў на Украіне. Усе заботы радавай ўлады аб працоўных так і засталіся на паперы. У сутнасьці іх палажэньне гэткае: сярэдняя месячнае заработная плата ўсяго 12 — 14 руб., на гаспадарскіх харчах 5—7 руб. у мес. Габочы дзень—12—13 гадзін для мужчын і 11—12—для жанок. Сярэдні ўзрост работнікаў—18 гадоў. Гэтак скасавала жыцьцё ўсе параграфы бальшавіцкага „Кодэкса аб трудзе".

ВЯЛІКІЯ МАНЭУРЫ ЧЫРВОНАГА ФЛЕТУ ў БАЛТЫЦКІМ МОРЫ.

20 ліпня ў Фінскім заліве пачаліся вялікія манэўры чырвонага флёта. На флагманцкім параходзе — дрэдноўце „Марат" знаходзяцца ваенны камісар Варашылаў, камісар флёта Муклевіч і камісар балтыцкага флёта Віктараў. У першы дзень манэўраў дэманстраваўся напад падводнай лодкі і прасьледаваньне яе аэраплянам. Пасьля пачаўся марскі бой. Як паведамляюць бальшавіцкія газэты, стрэльба ў часе гэтых манэўраў па ліку выстрэляных снарадаў перавышае ўсе апошнія манэўры. На другі дзень чырвоны флёт паказаўся ў берагоў Эстоніі. Манэўры гэтыя зьяўляюцца адказам на манэўры англійскай эскадры ў Балтыцкім моры.

ВАРАШЫЛАУ ЧАКАЕ ВАЙНЫ ў 1928 годзе.

На браняносцы „Марат у адкрытым моры, паодаль ад берегоў адбыўся агульны сход чырвонаармейцаў, на якім з падрабязговым дакладам аб вонкавым і унутраным палажэньні С. С. Р. Р. выступіў Варашылаў. Крануўшыся пытаньня аб ваеннай небясьпецы, Варашылаў адмеціў, што пагроза вайны стала рэальной і ўказаў, што наступны 1928 г. будзе ў гэтых адносінах самым цяжкім. Варашылаў закончыў свой даклад прызывам чырвонафлётцаў быць гатовымі для абароны С. С Р. Р.

Пужаюць вайною.

Варашылаў вымавіў прамову ў ваенным лагеры ў Красным Сяле, каля Петраграда, у якой між іншым сказаў: „Цяпер мы знаходзімся ў палажэньні, якое было перад вайною. Шмат азнакаў указвае на тое, што пашанцуе ўнікнуць вайны. Але ў апошні час пагоршалі адносіны як да радавай Расеі, гэтак сама і рабочай клясы ў усіх дзяржавах. Дзеля гэтага мусім паважна рыхтавацца да вайны. Перамога будзе за намі (ЯКАЯ САМАДУМНАСЬЦЬ!). Нашы лётнічыя сілы ня ўступаюць лётнічым сілам найвялікшых дзяржаваў. Гэтак сама і іншыя рады аружжа нашай арміі зрабілі значныя тэхнічныя пасьпехі!.

РАСТРЭЛ 9 АФІЦЭРАУ.

На прошлым тыдні ў Курску былі прысуджаны на сьмерць 9 афіцэраў царскай арміі, сярод якіх князь Шахоўскі апошні быццам працаваў у рад. Расеі як прадстаўнік „цара" Кірыла.

Гэнэралы Аненкаў і Дзэнісаў перад судом Г. П. У.

З Масквы паведамляюць, што там пачаўся працэс гэн. Аненкава і Дзэнісава абвінавачаных у ваяружоннай барацьбе проці радаў і масавых мардаваньнях прадстаўнікоў радавай ўлады Абвінавачаныя быццам прызналі сябе „віноўнымі".

ПАДПАЛЯЧЫ САУХОЗАУ.

У Луге агэнты Г. П. У. затрымалі шайку падпалячоў, складаючуюся з некалькі дзесяткаў чалавек. Сябры гэтай шайкі займаліся галоўным чынам падпалам школаў і савецкіх гаспадарак (совхозов).

ПАУСТАНЧАСКІ РУХ У УСХОДН. БЕЛАРУСІ.

Дзеля таго, што ў апошні час павялічыліся партызанскія напады на камуністаў і жыдоў на тэрыторыі Усх. Беларусі, бальшавіцкія ўлады рашылі прыступіць да арганізацыі на вёсках сярод комсамольцаў жыдоў і камуністаў „вясковых стралковых гурткоў".

БЬЮЦЬ ЖЫДОУСКІХ КАЛЕНІСТАУ.

Партызанскі атрад у сіле 30 коннікаў у ночы 18 ліпня напаў каля Слуцка на жыдоў — калёністаў, пабіў іх. і замардаваў зьверхніка радавай міліцыі Грынбэрга і некалькі міліцыянэраў. Сярод жыдоўскага насяленьня паніка. Жыды калёністы кідаюць сваю зямлю, маемасьць і бягуць да Слуцку і іншых гарадоў.

Мардуюць камуністаў.

У бальшавіцкіх газэтах зьмешчаны нэкралёгі 20 бальшавіцкіх урадоўцаў, замардаваных у апошні час.

Палажэньня работніка у „Сац. Раю".

„Правда" (№ 159) піша: ў Маскоўскай губ. абследаваны стан здароў'я 250,000 работнікаў. На кожныя 1,000 работнікаў прыходзіцца 308 хворых сухотамі. Зусім здаровых работнікаў і работніц ад 10 да 30 проц. Лечацца ня ўсе. На аднаго доктара прыходзіцца ад 700 да 1,000 хворых.

чы шчыраму патрыятызму не злавіўшыяся на бальшавіцкую уду!...

З тых-жа прычынаў, што і два раней шыя могуць зацікавіць віленскага чытача артыкулы: *„Сучасны стан Польшчы"* і *„Белы тэрор ў Польшчы"*.

З драбнейшых зацемак вельмі характэрнай зьяўляецца *адозва В. Ластоўскага*, ў якой гэты, ганебна прадаўшыся бальшавікам, ягомасьць усхваляе савецкі рай і заклікае беларускіх эмігрантаў да павароту!

Са зьместу хронікі відаць, што асінае гняздо беларускіх „камсамольцаў" у Праве расьце, а бальшавіцкая гангрэна што раз мацней точыць кволы арганізм нашае моладзі.

Паступовае (!) студэнцтва ў Праве мае ўжо тамака свой собскі Студэнцкі Клюб, заклала Праскі аддзел менскага „Маладняка", ня кажучы ўжо аб раней створаным беларускім Саюзе студэнтаў—грамадзян Б.С.С.Р.!! Гэта банда паробкаў III Інтэрнацыяналу, *выразна адракаючаяся* ў сваім журнале *ад незалежніцкіх і наагул нацыянальных ідэалаў*, як наіўных, буржуазных, контр-рэвалюцыйных і „прэстарэлых", а замест таго заклікаючуя з усіх сіл да сусьветнае рэвалюцыі, між іншым стараецца адцягнуць беларускае студэнцтва, асабліва яго віленскую частку ад адзінай і *найбольш паважнай* беларускай студэнцкай арганізацыі, ласьне — *А. Б. С. А.* (Аб'еднаньне Беларускіх Студэнцкіх Арганізацыяў Заходняй Беларусі і Эміграцыі якое на'т прынялі ў С. І. Е., і перацягнулі у свой чырвоны лагер, — дзеля гэтага беларускае патрыятычнае грамадзянства ў Вільні павінна парупіцца каб неяк абараніць нашую моладзь перад гэтай заразай, узмацоўваючы духовы з ёй контакт і даючы матэр'яльнае падтрыманьне!

Каб даць прыклад таго *асаблівага*, спэцыфічна-бальшавіцкага „стылю" у якім утрыманы ёсьць увесь журнал, даем тут характэрны пачатак зацемкі аб „Фашысцкай Літве":

„За апошнія часы сфашызаваная літоўская кабылка закусіла цуглі і, задраўшы хвост, нясецца да пропасьці. На чале Літва стаіць зараз банда галаварэзаў, за фунты прапаўшая сябе і з патрахамі ангельскаму капіталу, які імкнецца справакаваць С С.Р.Р. на вайсковую авантуру" і г. д. і г. д.

Адным словам у постаці *„Нашага Праменю"* прад намі — яшчэ адна *пляцоўка савецкае прапаганды* ў Заходняй Эўропе.

Ну што-ж! „Круці Гаўрыла!" — скажам мы па адрасу рэдакцыі, — толькі памятай, што калісь табе „ком партыя можа стаць комам ў горлі і на гэта ўжо ня доўга чакаць!

О.

Палітычныя хаутуры Рагуль-Ярэміцкага Саюзу.

У нядзелю 24 ліпня ў Вільні ў памешканьні „апалітычнага" Інстытуту Гаспад. і Культуры адбылася „конфэрэнцыя", зарганізаваныя выгнанымі з Сель-Саюзу ягонымі былымі правадырамі: Ярэмічам, Рагуляй і Більдзюкевічам. Каб быць зусім аб'ектыўнымі, ніжэй мы падаем, што аб гэтай конфэрэнцыі пішуць дзьве газэты зусім рожных і варожых напрамкаў — польскі „D. Wil." і грамадаўская „Наша Праўда". Іншыя газэты гэткае вялікае „сабыцьце" нават, як конфэрэнцыя, ў хроніцы не падалі! Гэтак „Dz. Wil." піша:

„Нефартунны „зьезд".

„У нядзелю ў Вільні адбыўся даўно дэкляраваны „зьезд прадстаўнікоў Беларускага Сялянскага Саюзу".

Ня гледзячы на даволі інтэнсыўна праведзенную агітацыю,каб на зьезд зьявілася як магчыма больш дэлегатаў, на „зьезд" гэты прыбыла ледзьве *8 особаў* (!) з правінцыі і 11—з Вільні Гэта ёсьць вялікай паражкай „беларускіх саюзьнікаў", якая іскрава сьведзчыць аб тым, што яны абсалютна ня маюць уплываў на вёсцы. Трэба ведаць, што на зьезьдзе гэтым „Беларускі Сялянскі Саюз" павінен быў быць прадстаўлены ня толькі праз дэлегатаў з Віленшчыны, але і з ваяводзтва Наваградзкага.

„З'езд" адчыніў пасол Ярэміч. Пасьля прамоваў на тэму „аб сучасным палітычным палажэньні сялянскага саюзу", ухваляны наступныя ў комуністычным духу рэзолюцыі: Дабівацца звальненьня палітычных вязьняў, скасаваньня даразных судоў, безплатнага падзелу зямлі і г. д. У рэзультаце праведзяных выбараў быў выбраны новы „Цэнтральны камітэт выканаўчы сялянскага саюзу" ў складзе наступным: пас. Ярэміч, пас. Рагуля, Юхневіч, Туронак, Більдзюкевіч, Куніцкі і Сьвістун!"

„Наша Праўда піша гэтак:

„Ну і з'езд"!

„Як падаюць газэты, на адбытым у мінуўшую нядзелю „з'ездзе" Ярэмічаўскай часткі Сель-Саюзу было прысутных (з усяе Заходняе Беларусі!) аж... 8 (выразна—восем) дэлегатаў з правінцыі і... 11 (адзінаццаць з Вільні...

Як відаць, гэнэралаў куды больш, як войска. Як чулі сябе „лідэры", — ведаць ім, але прамовы гаварыліся ўсё роўна, як і прад тысячнай публікай (пэўна ж паслы Ярэміч і Рагуля маюць добрыя лёгкія!).

У выніку аказаўся „выбраны" аж цэнтральны камітэт, куды ўвашлі п. п. Ярэміч, Рагуля, Більдзюкевіч, Юхневіч, Куніцкі, Сьвістун і Туронак. Чуць ня больш, як было прысутных на зьездзе. Але-ж!.. Самі сябе і выбралі.

Усё тыя ж і Пятрэнка.

А гэты Пятрэнка — п. Туронак, які, як здаецца, належыць і да складу такога-ж цэнтральнага камітэту хадэцы, ды прынамсі лічыцца ў ліку цэнтральных фігураў апошняе.

Вось як „паважна" выглядае „сялянскі" саюз п. п. Ярэміча і Рагулі.

Гэтак газэты.

Цяперака паслухаем, што гаворыць адзін з *дэлегатаў* „з'езду", як гэты „з'езд" адбыўся. Перадусім, што датычыцца складу „з'езду", дык ён „складаўся" ня толькі з сябраў сель-саюзу, а на ім былі людзі, якія нічога суполнага з саюзам ня маюць, як напр. прыехаўшы сэнатар Назарэўскі і інш.

Дэлегаты з провінцыі галоўным чынам складаліся з некалькіх маладых хлапцоў, быўшых курсантаў „Інстытуту Гасп. і Культ.", якіх пару месяцаў Інстытут утрымліваў у Вільні і ад якога яны яшчэ і цяперака залежаць, бо чакаюць дарэмна адкрыцьця Саюзам ці Інстытутам каапэратываў, ці.. адпраўкі бязплатнай да Амэрыкі!..

Старшынёю „конфэрэнцыі" быў п. Рагуля, сэкрэтаром п. Шчыгла (?) Першым забраў голас талянтны, высокаадукаваны п Ярэміч. Гаварыў, як заўсёды шмат... чапухі.

Пачаў ад крытыкі ўраду Пілсудзкага і даказаў, што пры ўрадзе Пілсудзкага жыцьцё беларусоў *горэй*, як пры ўрадзе эндэкаў. Гэта ў той час, як урад Пілсудзкага акурат апошнім часам асыгнаваў вялікую суму грошаў на засевы і на адбудову бел. насяленьню Наваградчыны (галасамі якіх прайшоў і Ярэміч!); калі ўрад зрабіў інтэрнат і падтрымлівае сродкамі *Наваградзкую* Гімназію; калі толькі што „т-ва школы" адтрымала дазвол на высшыя кваліфікацыйныя курсы для пэдагогаў беларускіх гімназіяў; калі, нарэшце, Віл. Бел Гімназі, надаюцца правы!.. Думаем, што нават у палітыцы і дэмагогіі трэба мець учцівасьць і сумленьне!..

Пасьля гэтай, „разумнай" і *„своечаснай"* крытыкі ўраду п. Ярэміч перайшоў, ну—зразумела!—на крытыку Бел. Нац Рады. Ня прамінуў лягнуць і п Умястоўскага з яго „Бел. Днём".

Затым перайшоў на крытыку Грамады, даказваючы, што, калі Бел. Нац. Рада залежыць ад Варшавы, дык Грамада ад Масквы і толькі ён *адзін* з сваім саюзам ёсьць праўдзіва—незалежным ні ад каго і ні ў чым.

А мы запытаем: *скуль* сель саюз *бярэ грошы* на *выдаўніцтва два* разы у тыдзень сваёй газэты; на падтрыманьне працы арганізацыйнай, а роўным чынам і безграшовага Інстытуту, які арганізуе курсы з поўным утрыманьнем 30 курсантаў у Вільні!, на субсыдыю тэатру, які ўсюды церпіць дэфіцыт, як гэта мы бачым з карэспандэнцыі з Лебедзева; і скуль была купляна *друкарня*, якая каштуе каля 15 тысячаў злотых Скуль вырас дамок і зямелька з лужком п. п. правадыроў, Ярэміча і Рагулі; скуль была заплачана за кватэру пад саюз і Інстытут у суме 8,600 злотых! Нарэшце скуль-жа грошы на самую „конфэрэнцыю", бо *ўсім* дэлегатам падарожныя грошы вярталіся, а нават некатарым (давераным!) давалася па 30 і 50 злотых! Скуль-жа грошы на добры абед з гарэлкаю (было 12 бутэлек!) для вучасьнікаў „конфэрэнцыі"? Скуль-жа, пане Ярэміч?...

Стуль, адкуль выкінулі нядаўна гэткага-жа вернага свайго служку—Ластоўскага удзячныя ковенскія *ліцьвіны*.. А за што даюць, няхай кожны беларус, памятуючы аб прэтэнсыях Літвы на Вільню, сам дагадаецца!..

Потым забраў голас новы этуаль саюзу п. Більдзюкевіч Апошні доўга хваліўся аб „вялікай" гаспадарчай працы, якую вядзе Сель-Саюз, а галоўным чынам яго Інстытут, езьдзячы ўсё па тым-жа камапэратыўным курсам.

Дэлегат з Дзісьненскага павету п. Анішкевіч зьвярнуў увагу на недахопы ў праграме саюзу ў справе зямельнай рэформы. Дэлегат з п. Несьвіскага п Матусевіч клікаў да правядзеньня *умяркаванай* працы (чуеце п. п. правадыры!.. П. Шчыгла (?) на заканчэньня „крытыкаваў" усе беларускія партыі і іх органы Ясна, што і тутака найбольш дасталося нам.

Далей „камісіямі"(?) былі запрапанаваны рэзалюцыі, якія маўчком, *бяз дыскусіі* былі прыняты безславеснымі дэлегатамі.

Характэрныя некатарыя з пастановаў у арганізацыйных справах. Гэтак было прынята, каб на будучыню саюз сваі аддзелы арганізаваў па сыстэме падобна камуністычным ячэйкам. Каб нрымаліся больш *асьцярожна* сябры.—Гэта відаць з тае прычыны, што ўсё чым дальш, тым больш сябраў кідае саюз. Выпадак з дэлегатам ад *цэлага* Маладэчанскага павету п. Гардзеям, які ня толькі не паехаў на конфэрэнцыю, не гледзячы на абяцанкі зьвярнуць „падарожныя" выдаткі, але які выйшаў з саюзу і далучыўся да Бел. Нац. Рады—відаць зрабіла сумнае ўражаньне на застаўшыхся сельсаюзьнікаў.

Характэрна і... гумарыстычна была прапазыцыя п Анішкевіча, які прапанаваў, каб абавязкова ўцягіваць у саюз... кабет! (Бо мужчыны ня хочуць ісьці!).

Нарэшце, ня гледзячы на абсталяваны добры абед і зварот „падарожных" грошы, сярод дэлегатаў падымалася гутарка аб тым, што жадных *пастаноў конфэрэнцыя рабіць ня можа*, бо гэта будзе непаважна — занадта *мала* прыехала дэлегатаў—і прапанавалася конфэрэнцыю адлажыць Аднак-жа правадыры, каб ўратаваць сваё бязвыхадна цяжкае становішча, асабліва пасьля скандалу з выключэньням іх з саюзу групаю Станкевіча,—гэтых слушных уваг сваіх сябраў не паслухалі, зразумела баючыся, што на адложанную конфэрэнцыю сяляне могуць зусім ня прыехаць. Аднак-жа. *мусячы* да гэтых гутарак дастасавацца, яны дэкляравалі праз месяц ці $1^1/_2$ склікаюць ужо... конгрэс!...

Два гады таму Сель-Саюз быў заложаны. Маючы вялікія сродкі і магчымасьці карыстацца парлямэнтскай трыбунай, ён мог шмат зрабіць. $1^1/_2$ гады таму была „конфэрэнцыя", на якой было прыезжых ажно 8 сябраў!...

Праз $1^1/_2$ гады на „конфэрэнцыю зьявілася *дзесяць* (!) дэлегатаў!...

Ці-ж гэта не хаўтуры Ярэміцка-Рагульскага саюзу?...

БЕЗРАБОТНЫЯ.



Чычэрын робіць смотр безработнай арміі загранічных прадстаўнікоў. У першых радах выгнаны з Кітая пасланнік Чэрных, з Лёндана—Розэнгольц, з Канады, Аўстраліі і г. д.

УСЯЧЫНА.

Плывучы востраў.

У наступным месяцы пачнецца будоўля першага плывучага вострава ў Атлянтыцкім акіяне па пляну амэрыканскага інжынэра Эдварда Армстронга. Востраў будзе разпаложаны ў 870 кілямэтрах на Усход ад Нью-Іорку. Гэта моцна прыкраплёная да марскога дна стальная плятформа, раўнавагу якой ня смогуць нарушыць нават самыя моцныя буры. Даўжыня вострава — 365 мэтраў, шырыня — 120 і вышыня — 100 м. Ен будзе прытарнаваны для спуска аэрапляпаў, а ланцуг наступных вастравоў праз кожныя 650 кілямэтраў будзе служыць станцыямі для воздушных караблёў у акіанскіх рэйдах.

Тутэйшая хроніка

— МАРШАЛАК І. ПІЛСУДЗКІ У ВІЛЬНІ. Маршалак Пілсудзкі прыехаў на некалькі дзён да Вільні па радзіным справам.

— РОСПУСК ПАВЯТОВЫХ СЭЙМІКАУ. У суботу 23 ліпня ваеводзкі ўрад выслаў рэспараджэньне да старшынь павятовых аддзелаў аб роспуску старых павятовых сэймікаў і праізводстве новых выбараў у магчыма хуткім тэрміне на тэрыторыі віленскага ваеводзтва.

— КРЭДЫТЫ НА КАМАСАЦЫЮ. Акружны Земскі ўрад у Вільні адтрымаў ад міністэрства зямельных рэформаў цыркуляр, у якім прапануецца, каб пры выдаваньні крэдытаў на тэрміновую акцыю абмежовываліся толькі тымі ўласьнікамі дробных падзелаў зямлі, якія запраўды ні ў можнасьці правадзіць камасацыі (выхаду на хутары) уласнымі сродкамі. З гэтай мэтаю падуладныя ўраду інстытуцыі павінны строга праверыць маемасьць тых гасобаў, хто просіць крэдыта на правядзеньне камасацыі. Што датычыць да крэдытаў на рольную меліёрацыю, дык іх можна выдаваць толькі на куплю прыладаў і матэр'ялаў, на аплату тэхнічнага абароту і спэцыялісты па меліярацыйнай працы. У той час кошт працы павінен аплачываць уласнік, праводзячы на сваём грунце меліёрацыйную працу.

ЗАПАМОГА ДЛЯ АХВЯРАУ ГУРАГАНА Ў НАВАГРАДЗКІМ ВАЯВОДЗТВЕ.

Да Варшавы прыехаў 23 ліпня наваградзкі ваявода П. Бечковіч і меў цэлы рад конфэрэнцыяў, між іншым у міністэрстве ўнутраных справаў выступіў з жаданьнем павялічэньня сумы для надзвычайнай запамогі земляробам, пацярпеўшым ад гурагану. Пытаньне аб павялічэньні сумы запамогі знаходзіцца на пэўнай дарозе.

Адклад грунтовага падатку.

Міністэрства скарбу выслала да ўсіх скарбовых ізбаў цыркуляр, прапануючы адлажыць спозьняныя і бягучыя (за 1927 і першую рату 1928 г.) належнасьці грунтовага падатку да 1 кастрычніка 1928 г. без кар за спазьненьне ў усіх тых выпадках, у якіх ураджай зьнішчаны градам на 40%. У прынцыпе адкладаньне гэта будзе прызнавацца на аснове індывідуальных просьбаў. А што датычыцца дробных гаспадарак (да 43 гэктараў), дык павінны быць прыняты пад увагу просьбы (podania) агульныя роўным чынам і заявы гмінных самаўрадаў.

З мэтаю акрэсьленьня разьмера шкоды могуць карыстацца запамогаю і супольніцтвам рольных арганізацыяў. У выпадках поўнага ці частковага пакрыцьця шкоды страховымі таварыствамі ўказаных льготаў не належыць даваць, ці належыць абмежаваць.

Указаныя льготы датычаць прынцыпова дзяржаўнага грунтовага падатку. Адкладжа тэрмінаў уплаты самаўрадавых падаткаў можа наступіць толькі пасьля адтрыманьня згоды старшыні павятовага аддзелу.

У канцы цыркуляр зьвяртае увагу на тое, каб просьбы аб льготах з поваду стыхійных катастрофаў вырашаліся магчыма хутчэй, а скарбовыя ізбы павінны сачыць за правідловым і своечасным вырашэньнем гэтага рода просьбаў.

Узысканьне іншых падатковых залежнасьцяў (падатку дахадовага і маёнковага) належыць прымяняць з вялікаю асьцярожнасьцю ў адносінах плацельшчыкаў, пацярпеўшых ад катастрофы града.

ЖЫЦЬЦЕ ПРОВІНЦЫІ.

Перамога нацыяналістаў.

(*Ад ўласнага карэспандэнта*).

У нашай Палачанскай гміне з 10 выбраных радных — 8 беларусаў і 2 палякі.

З беларусаў: 7 са сьпіску нацыянальнага, прычым М. Пятровіч, М. Сенька, П. Шафаловіч, А Дзеніс — інструктары Цэнтр Бел. Нац. Выб. К-ту. і 1 — умяркаваны — з партыі „куды вецер дзьме“ — Янка Кknown, селянін – пралетары, ня ідэовы. Хто больш дасьць за таго агітуе і галасуе. На выбарах ішоў разам з абшарнікамі, якія абяцалі яму, што, калі будзе за іх агітаваць і галасаваць, дык зробяць яго войтам, бо ён быў радным у старай Радзе. Але на выбарах да ўраду гміны яму ў неспадзянку радный п. Пуцята выставіў кандыдатам у войты кума свайго — шляхцюка Сьцяпана Міньковскага, які, будучы дагэтуль сэкрэтаром гміны, вельмі непапулярны паміж беларусаў Палачанскай гміны і ўрадаваў, як толькі яму падабалася. Кіраваў войтам Міх Леганам, як хацеў, як той шофэр рулём ў самаходзе, а народ цярпеў, сьціснуўшы зубы і чакаў усё новых выбараў. Стары войт Леган разумеў гмінныя справы, як корак ад піўнай бутэлькі.

На заступніка войта той самы п. Пуцята выставіў нарэшце — Янку Кананові́ча, але мы беларусы нацыяналісты правалілі іхнія кандыдатуры і сваімі галасамі выбралі гэтакі гмінны ўрад:

Войтам — М. Пятровіча.

Заступнікам — П. Шафаловіча і лаўнікам Ст. Паўловіча тутэйшага паляка, — чалавека справядлівага. І мы, нацыяналісты, каб упэўніць, што хочам жыць і працаваць ў згодзе з палякамі, аддалі за ягоную кандыдатуру свае галасы.

Стары войт Леган, сэкрэтар Міньковскі і Янка Кананові́ч бьюць трывогу і крычаць, што не дапусьцяць, каб Пятровіч быў-бы войтам, але выбары ўжо пан Староста зацьвердзіў. Цікава, як гэта будуць працаваць разам — войт Пятровіч — выбранец беларусаў і стары сэкрэтар Міньковскі, гэтак непапулярны ў народа.

Мы мусім зазначыць, што факт зацьверджаньня п. Пятровіча войта новым Маладэчанскім Старастай п. Пікутоўскім ўказвае на здольнасьць яго ар'ентацыі ў палітычна-крэсавых адносінах і сьведчыць аб фактычнай зьмене адносінаў мейсцовай адміністрацыі да беларусаў.

Н. В-т.

З ВАЛОЖЫНШЧЫНЫ.

Выбары да самаўрадаў правадзіліся неяк патаемна, але нягледзячы на тое, што на вёсках сялянам афіцыяльна ня было ведама аб выбарах, ў гмінах Валожынскай, Першайскай, Дэрэвненскай, Налібоцкай і Івейскай большасьць радных выбрана са сьвядомых Беларусаў нацыяналістаў, былых „вызваленцаў“, а цяпер прыхільнікаў Бел. Нац. Партыі і Рады. Хаця-ж партыя вызваленцаў і ашукала беларусаў — сялян, але за тое прывучыла да арганізацыі і стойкасьці за свае правы.

Левага кірунку элемэнтаў зусім няма.

П-ч.

РАДЗІВАНІШКІ

Лідзкага пав.

Усюды ў ваколіцы, каля нас, пачалі адбывацца выбары па абводах, якія павінны былі выбіраць прадстаўнікоў да гміннай рады. Гэтак сама адбыліся і ў нас у Радзіванішках, Тарноўскай гміны, але ня так, як усюды. Мейсцовы вучыцель-дзяржаўнай пачатковай школы Л. І. Гельмі жадаў быць выбраным ад нашага абводу № 7., але бачучы, што яго кандыдатура ня пройдзе, пусьціўся на гэтакую хітранку. Калі пачало адбывацца галасаваньне па сьпіскам, гэты пан, як сябра абводовага камітэту, пачаў дапісываць сабе нехапаючыя галасы, лічучы свой голас за пяць сялянскіх. І гэтакім чынам здабыў сабе патрэбную лічбу галасоў. Дзеля гэтага наш вучыцель супроціў жаданьня, быў выбраны ў лік дэлегатаў ад Радзіванішскага абводу. Нарэшце, калі пачалі чытаць вынікі выбароў, дык у хаце засталася толькі большая частка прыхільнікоў гэтага вучыцеля і ніхто адразу ня меў магчымасьці запярэчыць, што тут зроблена машэнства. Пасьля, калі аб гэтым дачуліся ўсе іншыя выбаршчыкі, дык зараз-жа паслалі свой пратэст да Лідзкага старасты. Дык вось, браточкі, як адбыліся выбары ў нашым абводзе номэр 7.

Прысутны.

СПЭКТАКЛЬ.

(*в. Бабры Лебедзеўскай гм.*)

За тыдні чатыры да сёмухі аматорскае кола артыстаў у вёсцы Бобры, Лебедзеўскай гміны, Лідзкага павету ўзялося за сур'ёзную працу па пастаноўцы спэктаклю ў сваей вёсцы. Хоць час быў і рабочый, але артысты ня гледзячы на гэта, акуратна зьбіраліся тры разы на тыдзень па вечарох у школу, дзе амаль ня цэлую ноч рабілі рэпэтыцыю, пад кіраўніцтвам вучыцеля пачатковай школы ў Бобрах Антона Ахрэмчыка. Шыкавалі дзьве п'есы: польскую, зложанную самім вучыцялем Арцемчыкам, трагэдыю „Nie w bogactwie szczęście, lecz w docrym spożyciu małżeńskim“ і беларускую камэдыю „Збянтэжаны Саўка“. П'есу гэту дасталі дзякуючы Кастусю Маеўскаму ў Лідзкім гуртку т-ва „Прасьветы“.

За тыдзень да сёмухі самі артысты збудавалі сцэну ў школе, дзе меў адбыцца спэктакль і апошнія рэпэтыцыі рабіліся на сцэне з усімі патрэбнымі рэчамі; навэт прынасілі курыцу і яйкі, на якую садзіўся Саўка. Апошняя рэпэтыцыя з вялікім пад'ёмам адбылася ў суботу перад сёмухай 11 чэрвеня у вечары. Усе артысты разышліся пасьля поўначы, хаць вельмі зморaныя, але моцныя духам, цешачыся, што рэпэтыцыя выйшла як ня трэба ляпей і шчыра прасілі ў Бога на заўтрашній дзень пагоды. Патрэбная дэкарацыя была з густам выканана Мастаком Сьцяпанам Пуцькай, які з вялікім спагаданьнем аднёсся да пастаноўкі спэктаклю. На заўтра, 12-га чэрвеня, хоць пагода была і кепская, ліў дождж, але артысты не ўпалі духом і з самай раніцы зносілі крэслы, услоны, лаўкі, дзе хто што дастаў, ў школу, каб даць патрэбны лік местаў. Артыстамі былі хлапцы і дзяўчаты, ўсе з вёскі Бабры. У польскай трагэдыі прымалі удзел: вучыцель Антон Ахрэмчык, сястра яго Алеся Ахрэмчык, Мікалай Гагалушка, Янка Крыпень Зося Гагалушка і Паўла Ковальчук. У беларускай: Саўку гуляй Мікалай Гаголушка, жонку Саўкі—Паўліна Кавальчук, а жабрака—Кастусь Хартановіч. Пад вечар дождж перастаў і людзі сталі ісьці з усіх вёсак; надышло столькі, што не хапіла мейсца ў школе так, што паднялі усе вокны і яшчэ стаялі нават пад вокнамі З вялікай увагаю была праслухана польская трагэдыя, артыстаў пекна іграўшых, засыпалі громам воплескаў, у часе антрактаў школьнікамі былі прадэклямаваны вершы на польскай і беларускай мове. Надта добра сказаў „przysięga Kościuszki“ 12 ці гадовы хлапец Н. Чыжык, а беларускі верш „Панскае ігрышча“ быў прадэклямаваны гэтак умела 12-ці гадовым хлапцом Александрам Гагалушка, што проста ня паверыл-бы ніхто, што гэта вясковы. Яму білі брава ажно тры разы.

Беларускую камэдыю адыгралі так пекна, што публіка прасіла, каб кожны спэктакль было што-небудзь і беларускае. Спэктакль закончыўся ў час ночы. Пасьля спэктаклю былі сьпевы вучыцеля з дзяцьмі, а потым скокі, гралі на гармоні і скрыпцы; усе старэйшыя пасьля сьпеваў пайшлі здаволеныя адпачыць, а маладыя хлапцы і дзяўчаты скакалі да раніцы.

Гэтак кончылася культурнае урачыстае сьвята ў нашай вёсцы. І ўвесь чысты даход ад спэктаклю паступіў на павялічэньне школьнай бібліатэкі.

Прысутны

в. Бабры.

НОВАЕЛЬНЯ

(*Наваградзкага пав.*)

19 чэрвеня г. г. адбыўся спэкталь на ст. Новаельня, Наваградзкага пав. у салі „Огніска Колеёвага“ наладжаны драматычнай трупай гуртка Беларускага Таварыства „Прасьвета“ ў м Дзятлаве. Была пастаўлена п'еса ў 3-х актах Фр Аляхновіча „Штучка шчасьця. Публікі сабралося шмат, папрыходзілі хлапцы і дзяўчаты з акружаючых вёсак.

Спэктакль меў вялікі усьпех, пасьля кожнага акту нескапечнымі вопляскалі прысутныя спатыкалі артыстаў Мікалая Белуша ў ролі Янкі, Надзею Чырвоную ў ролі „Маланкі“ — Леона Бурдуна ў ролі жыда і Уладзіміра Чырвонага.

У сярэдзіне другога акта публіка была задаволена выступленьнем на сцэну маленькага—гнома— пана Подгурскага.

Добрая пастаноўка і вопытная гульня артыстаў зрабілі вялікае уражаньне на прысутных Воплескамі быў выкліканы на сцэну рэжысэр пан А. Лазоўскі, які сумеў падгатовіць у такі кароткі час маладых артыстаў да гульні рожных п'ес Пасьля п'ес выступіў на сцэну беларускі хор, які праняяў на беларускай і польскай мовах, „У каміна“ і выпаўніў цэлую чаргу рожных беларускіх песень, хор хаця не ў вялікім складзе, але добра сумеў выпаўніць сьпевы. Так-жа выступіў А Лазоўскі, якому доўга апладзіравала публіка Закончыўся спэктакль скокамі пад ігру струнага аркестру.

Публіцы вельмі падабалась гульня беларускай трупы. Вечарынай кіраваў пан У. Гарбун, які, не шкадуючы сілы, стараецца павялічыць трупу і аб'ехаць вёскі і мястэчкі Наваградзкага ваяводзтва з мэтай пастаноўкі спэктакляў і арганізацыі аматорскіх кружкоў на мейсцох.

Глядзельнік.

ГРОДЗЕНШЧЫНА.

Вайна 1914 г. прынясла ня мала бяды для нашага беларуса. Яна зьнішчыла яго гаспадарку і цяпер вельмі трудна жывецца. Ніяк ня можа ён стаць на ногі. Але трэба праўду сказаць, што гэта вайна прынясла яму і карысьць: яна адчыніла яму вочы на сьвет, і ён цяпер ведае, што ён чалавек.

Трудна беларусу жывецца, бо адразу і без запамогі ён ня можа подняцца і вясьці сваю гаспадарку. Яшчэ ня так трудна тым, ў каго пазаставаліся хаты і другія будынкі, альбо хто зусім ня выежджаў да Расеі ў часе вайны. Есьць яшчэ шмат беларусаў ў каторых нічога няма і яны да гэтай пары жывуць ў зямлянках, як краты ў норах, жыцьце іх страшэнна цяжкае. Але, дасьць Бог можа і іх жыцьцё хутка палепшыцца. Гавораць, што ўрад хоча ім даць грашовую запамогу на будоўлю хат і іншых будынкаў. Як кажуць ў нас, урад праэктуе будаваць гэтым беларусам пастройкі з гліны. Маюць нібыта адчыніцца курсы глінабітных пастрояк, каб даць беларусам інструктараў, бо самі яны не зразумеюць, як будаваць пастройкі з гліны. Калі гэта праўда, дык можна толькі гэтаму радавацца. Але з гэтай работаю ня трэба сьпяшыць. Трэба раней памяркаваць, чы гэтыя пастройкі будуць адпаведны для нашага беларуса. Мы знаем, што наш край мае шмат вільгаці і што пастройкі з гліны будуць ня зусім карысны, для здароўя людзей. Заўсёды у гэтакіх пастройках будзе вільгаць, а пры вільгаці могуць зьяўляцца і хваробы. Пастройкі з гліны можна сьмела рабіць для ската, а для жыцьця чалавека — трэба затрымацца і добра абмяркаваць, каб пасьля не каяцца. Добра будаваць хаты з гліны ў сухіх местох, а ня ў нас. Хочыцца верыць, што наш урад ў хуткім часе паможа нашаму брату — беларусу выбрацца з сваіх нораў і выйсьці на сьвет Божы, бо надта ўжо яны пакутуюць і ня можна іх не пашкадаваць.

Городзянін.

Паштовая скрынка.

М. Жданко, Н. Савчынскі, А. Худніцкі, Ян Кузьміч, Д. Лебедзеў, Ю. Цыонэль, М. Волкоўскі, К. Аляксандроўскі, Ул Кудасаў, Я Ковальчук, Р. Коршун І Капарскі, Д Малевіч, А Дзеньковіч, П. Аляхновіч, І. Томашэвіч, І. Шэрбіцкі, Ю Невядомскі, С. Шыкаловіч, М. Габойскі, Ул. Кірык, Р. Гоголушко, В. Жэброўскі, М. Сцэпуржынскі, М. Голенкэвічу, К. Александроўск, А. Венско, І Макарэвіч, Д. Губако, Эд. Ушко, Я.Холевінскі, Селевіч, П. Сянкевіч, Я. Чыжык, М. Грыцкевіч, М. Волынец, М. Мацюк, А. Буркін, М. Опалько, К Гемза К. Сорока, І. Мілан, С. Вайтовіч, М. Казёл, І. Лавіш, І. Буднік, М Белеўскі, А. Рыжкоўскі, С Псемерняк, В. Шашка, С. Шашко, М. Мась, П Сьліж, М. Урбановіч, А. Невэртовіч Ю. Жамайда, Г Крупец, Я. Зімодра А. Сарока, М. Кароткі, І. Бубен, Я. Вашаркевіч, П. Божко, А. Свірыда М. Белань, Н. Сінявскі, С. Странкоўскі, М. Головач, І. Пужэўскі, Б. Шафаловіч, І. Ясюкевіч, А. Гапенко. А. Савловец, А. Дзеніс,—пробныя нумары высылаем. Прысылайце грошы за падпіску.

Сыльв. Камар — 2 зл. Дан. Запелаў 2,50 зл. адтрыманы. Газэта высылаецца.

Адказны Рэдактар Т. Вернікоўскі. Друк. І. Баеўскага Вільня, Мастовая 9. Выдавец Беларуская Нацыянальная Рада.